Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№116 (28480)

21 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12

Балючыя кропкі АПК



Як харчуюцца ў полі?

З-за чаго беларусы хварэюць?

СТАР. 13

НАД РАКОЙ ПАЛАТОЙ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вузкі і доўгі пешаходны мост над вусцем ракі Палата, які звязвае гістарычны цэнтр Полацка з адным з прыватных сектараў горада, рэдка бывае малалюдным.

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый КРУПСКІ, начальнік упраўлення эканомікі інавацыйнай дзейнасці Міністэрства эканомікі:

«Чакаецца, што ў канцы гэтага года — першым квартале 2018-га выйдзе адкарэкціраваны ўказ №255, па якім будзе аказвацца дзяржпадтрымка для арганізацыі кластарных праектаў. Пры гэтым будуць падтрымлівацца праекты, якія прадугледжваюць фарміраванне перш за ўсё інавацыйна-прамысловых кластараў у высокатэхналагічных галінах эканомікі. Гэта прынцыповая пазіцыя».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 21.06.2017 г.

Долар ЗША	1,9016	▲
Еўра	2,1203	▲
Рас. руб.	0,0324	▼
Укр. грыўня	0,0730	▲

ISSN 1990 - 763X

■ Жывіце ў бяспецы

КАЛІ ВАДА — БЯДА

Як адпачыць без рызыкі для жыцця?

Сумная вестка прыйшла на выхадных са Столінскага раёна. Група падлеткаў адпачывала каля ракі непадалёк ад вёскі Ямнае. Кампанія разышлася, на беразе засталіся толькі двое — 17-гадовы выпускнік школы і дзяўчына. Хлопец зайшоў у ваду. Але дно там аказалася няроўнае. Плаваць юнак не ўмеў. У нейкі момант ён спаткнуўся і знік пад вадой...



Па стане на 19 чэрвеня вада адабрала жыцці 99 чалавек, у тым ліку 7 непаўналетніх. Уратаваць ад смерці паспелі 81 няўдачлівага плыўца, сярод якіх было 28 дзяцей. А вось папярэджанняў было вынесена шмат — ажно 6634.

— У цэлым па краіне і па Мінску склалася добрая тэндэнцыя па памяншэнні гібелі на вадзе, — кажа **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Таварыства ратавання на вадзе Фёдар КЛЮКАЧ.** — Напрыклад, у 1990-я гады ў Мінску штогод танула 120—130 чалавек. У крайне спякотным 2015 годзе іх было ўжо 63. А летась — 41. Гэтаму зніжэнню спрыяе шчыльная ўзаемасувязь з усімі зацікаўленымі арганізацыямі.

СТАР. 4

■ Працяг тэмы

«РЭЗАНАНСНАЯ» ЎСТАНОВА

Публікацыя «Жыльцы супраць «100 грамаў», якая выйшла ў газеце 6 мая, стала рэзанансная. Размова ішла пра «Чарачную» ў жылым доме №18 на вуліцы Чапаева ў Віцебску. Людзей абурала рэклама піцейнай установы, тое, што яна працуе да 11 гадзін ночы, і не толькі.

Непрыемнае суседства

Дарэчы, раней на гэтым месцы знаходзіўся стары жылы дом без «комплексу» камунальных выгод. Пасля зносу некалькіх дамоў на Чапаева, якія не адпавядаюць патрабаванням часу, жыхары, згодна з гарадской праграмай перасялення, атрымалі ключы ад новых кватэр. А на месцах, якія вызваліліся, былі пабудаваныя шматпавярховыя дамы. Сотні людзей павінны быць задаволеныя. Але не...

СТАР. 3

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!